УДК 711.4

# НАВУКА АБ ЧАЛАВЕЧЫХ ПАСЕЛІШЧАХ: АКТУАЛІЗАЦЫЯ ІДЭЙ КАНСТАНТЫНАСА ДАКСІЯДАСА

*Д. А. ЧАБАТАР*

*Навуковы кіраўнік – П. Г. Вардэванян (ст. выкладчык)*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, г. Мінск*

У апошнія гады канцэпцыя «разумных гарадоў» актыўна развіваецца, спрыяючы інавацыйным і ўстойлівым праектам, якія заклікаваны адказаць на выклікі сацыяльна-эканамічнага характару, звязаныя са змяненнем клімату, дэмаграфічнымі зрухамі і міграцыйнымі працэсамі. Асноўная логіка прасоўвання гэтай ідэі заключаецца ў тым, што сёння больш за палову насельніцтва планеты жыве ў гарадах. Менавіта гарадскія тэрыторыі становяцца ключавымі цэнтрамі эканамічнага развіцця і інавацый. У гэтым даследаванні будзе разгледжана сутнасць экістыкі, яе ключавыя ідэі і канцэпцыі, а таксама магчымасці іх актуалізацыі ў сучасным урбаністычным дыскурсе.

***Канстантынас Даксіядас*** – грэчаскі архітэктар і горадабудаўнік, заснавальнік навукі аб чалавечых паселішчах – экістыкі, аўтар праекта новай сталіцы Пакістана Ісламабада, чалавек, які быў адным з заснавальнікаў таго горадабудаўніцтва, аб якім мы ведаем [3]. Нарадзіўся ў Афінах у 1913 г., скончыў Афінскі палітэхнічны інстытут і Берлінскі тэхнічны ўніверсітэт. Пасля вайны працаваў намеснікам міністра рэканструкцыі Грэцыі. У 1951 г. заснаваў кампанію *Doxiadis Associates*, якая хутка стала глабальнай сеткай і ў 1963 г. ператварылася ў *DA International Co. Ltd*. Менавіта яна распрацавала і рэалізавала праект Ісламабада – адзін з найбуйнейшых прыкладаў увасаблення ідэй экістыкі [3].

*Што такое экістыка?* ***Экістыка*** – гэта навука аб чалавечых паселішчах, што ўлічвае прынцыпы, якімі чалавек кіруецца пры будаўніцтве сваіх паселішчаў, а таксама эвалюцыю чалавечых паселішчаў праз гісторыю – па памеры і якасці. ***Мэта*** – пабудаваць горад аптымальнага памеру, горад, які паважае чалавечы маштаб [1].

***Аб’ектам экістыкі*** з’яўляецца ўвесь спектр чалавечых паселішчаў, што ў сваю чаргу з’яўляецца даволі складанай сістэмай, што складаецца з пяці элементаў: прырода, чалавек, грамадства, абалонкі, сеткі, культура.

***Прадметам*** жа экістыкі з’яўляюцца чалавечыя паселішчы ва ўсіх іх формах і маштабах. Яна разглядае гэта як складаную сістэму прыродных, сацыяльных і штучных элементаў, якую можна разглядаць з розных бакоў – эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і інш.

Па сутнасці, экістыка прапануе злучыць веды з розных галін (архітэктура, сацыялогія, урбаністыка і г. д.) ў дзейную сістэму з мэтай развіваць чалавечыя паселішчы. К. Даксідыядас вылучае пяць асноўных прынцыпаў фарміравання паселішчаў:

1 **Максімізацыя кантактаў** – чалавек імкнецца пашыраць сувязі з іншымі людзьмі, прыродай і створанымі ім аб'ектамі.

2 **Мінімізацыя высілкаў** – імкненне да аптымальнага выкарыстання ўласных рэсурсаў у дасягненні гэтых кантактаў (напрыклад, выбар найкарацейшага шляху).

3 **Ахоўная прастора** – патрэба ў асабістых межах і абароне ад негатыўных фактараў (планіроўка жылля, сацыяльныя дыстанцыі).

4 **Якасць узаемаадносін** – жаданне паляпшаць сувязі з людзьмі і асяроддзем, ствараць камфортныя ўмовы жыцця.

5 **Інтэграцыя прынцыпаў** – гарманізацыя ўсіх папярэдніх фактараў у залежнасці ад часу, месца і рэальных умоў [2].

Таксама адным з адпраўных пунктаў у даследаванні чалавечых паселішчаў К. Даксіядас вылучае **класіфікацыйны падзел чалавечых паселішчаў па памеры** (табліца 1).

*Табліца 1* – **Класіфікацыйны падзел чалавечых паселішчаў**

| | | |
|---|---|---|
| Фізічнае вызначэнне | Індывід | Асобны чалавек як адзінка прасторы |
| | Пакой | Асабістая прастора, дзе чалавек жыве або працуе |
| | Сямейны дом | Жыллёвая адзінка, сямейная прастора |
| Сацыяльнае вызначэнне | Супольнасць | Група дамоў, мікрараён, квартал |
| | Горад | Урбанізаванае паселішча з цэнтрам і функцыямі |
| | Урбаністычны рэгіён | Сістэма ўзаемазвязаных гарадоў і паселішчаў |
| | Урбаністычны кантынент | Вялікія агламерацыі, звязаныя інфраструктурай |
| | Экуменаполіс | Глабальны горад – уся планета як адзінае паселішча |

Важным аналітычным інструментам у разуменні чалавечых паселішчаў у канцэпцыі К. Даксіядаса з'яўляецца класіфікацыя іх структурных кампанентаў (малюнак 1). Паводле яго, кожнае паселішча складаецца з пяці ўзаемазвязаных элементаў:

1 ***Прырода***, якая ўключае геаграфічныя і кліматычныя ўмовы.

2 ***Грамадства*** ахоплівае сацыяльныя структуры і паводзіны людзей.

3 ***Абалонкі*** фізічных канструкцый, такіх як будынкі і іншыя архітэктурныя формы.

4 ***Сеткі,*** якія забяспечваюць транспартныя і камунікацыйныя сувязі.

5 ***Культура*** уключае каштоўнасці, звычаі і ідэнтычнасць супольнасці [4].

На аснове гэтых прынцыпаў, класіфікацыі і элементаў К. Даксіядас распрацаваў шэраг ключавых канцэпцый, сярод якіх дынаполіс, экуменаполіс, энтопія.

**Дынаполіс** – гэта канцэпцыя пра *дынамічны горад будучыні*, які здольны пастаянна адаптавацца да патрэб чалавека і тэхналагічнага прагрэсу. Ён разглядаўся як пераходны этап паміж сучасным мегаполісам і будучым сусветным горадам – экуменаполісам. Гэтае паселішча будзе грунтавацца на наступных правілах:

1 ***Дынамічнасць развіцця:*** горад не з'яўляецца статычнай структурай, пастаянна змяняецца, каб адпавядаць новым патрэбам насельніцтва і тэхналогіям.

2 ***Гнуткая планіроўка:*** у дынаполісе прастора арганізавана так, каб лёгка трансфармавацца – усё можа перабудоўвацца без страты функцыянальнасці.

3 ***Інтэграцыя тэхналогій:*** у аснове горада – выкарыстанне сучасных тэхналогій кіравання, камунікацый і энергетыкі, што робіць яго «разумным» яшчэ да з'яўлення сучаснага паняцця Smart City.

4 ***Чалавечы маштаб:*** нягледзячы на вялікі памер, горад павінен захоўваць камфортныя ўмовы для жыцця чалавека.

5 ***Пераходная роля:*** дынаполіс разглядаецца як неабходны этап эвалюцыі паселішчаў, які падрыхтуе чалавецтва да экуменаполіса.

***Экуменаполіс*** – гэта будучае чалавечае паселішча, што ахоплівае ўсю планету. Гэта вынікае з немінучага росту ўрбанізацыі, які прывядзе да зліцця ўсіх паселішчаў у адзіны населены пункт, дзе людзі будуць жыць у супольнасцях, злучаных паміж сабой сеткамі камунікацый. Гэтае паселішча будзе грунтавацца на наступных правілах:

1 ***Непазбежнасць урбанізацыі:*** развіццё ад *мегаполіса* праз *дынаполіс* прывядзе да *экуменаполіса*.

2 ***Структура жыцця:*** насельніцтва будзе жыць у адзінках па 30–50 тыс. чал., падобных да гарадкоў, але інтэграваных у глабальную сетку.

3 ***Інфраструктура:*** транспартныя магістралі, камунікацыі, харчовыя каналы і іншыя сістэмы будуць перанесены пад зямлю, каб паверхня заставалася прыдатнай для жыцця і прыроды.

4 ***Сувязь з прыродай:*** «шчупальцы прыроды» павінны пранікаць у гарадскія тэрыторыі, каб захаваць баланс паміж урбанізацыяй і экалогіяй.

5 ***Глабальная перспектыва:*** экуменаполіс разглядаецца як вынік гістарычнай эвалюцыі паселішчаў.

**Асобнае месца сярод ідэй К. Даксіядаса займае *энтопія*** – гэта канцэпцыя пра *гарманічнае месца для жыцця чалавека*. У адрозненне ад

утопіі (нямесца) і дыстопіі (дрэннае месца), энтопія азначае рэальнае, дасягальнае асяроддзе, дзе чалавек можа жыць у балансе з прыродай, грамадствам і тэхналогіямі (малюнак 2).




Малюнак 1 – Узаемадзеянне аспектаў чалавечага паселішча
Па вертыкалі: эканоміка; сацыяльныя навукі; палітыка; тэхналогіі; культура
Па гарызанталі: прырода, чалавек; грамадства; абалонкі; сеткі



Малюнак 2 – Энтопія

Гэтае паселішча будзе грунтавацца на наступных правілах:

1 **Рэальнасць і дасягальнасць**: энтопія не з’яўляецца фантазіяй ці ідэалам, яна павінна быць рэальна створана ў канкрэтным месцы і часе.

2 **Баланс з прыродай**: чалавек жыве ў асяроддзі, дзе прыродныя фактары не знішчаюцца, а інтэгруюцца ў гарадскую прастору.

3 **Сацыяльная гармонія**: арганізацыя забяспечвае здаровыя ўзаема-адносіны паміж людзьмі, павагу да асабістых межаў і г. д.

4 **Культурная ідэнтычнасць**: улік традыцый, каштоўнасцяў і культуры, каб чалавек адчуваў сябе «у сваім месцы».

5 **Інтэграцыя тэхналогій**: тэхнічныя інавацыі выкарыстоўваюцца для паляпшэння якасці жыцця, але не парушаюць баланс.

Як можна актуалізаваць шэраг ідэй К. Даксіядаса?

1 ***Устойлівае развіццё:*** прынцыпы экістыкі добра суадносяцца з мэтамі ААН (SDGs). Яны падкрэсліваюць неабходнасць гарманічнага развіцця гарадоў, уліку экалагічных фактараў і захавання культурных каштоўнасцяў.

2 ***Разумныя гарады:*** Даксіядас бачыў горад як дынамічны арганізм. Сёння гэтая ідэя актуалізуецца праз Smart City – інтэграцыю IoT, штучнага інтэлекту і кіраванне данымі для павышэння якасці жыцця.

3 ***Глабальная урбанізацыя:*** канцэпцыя экуменаполіса сугучна сучасным тэндэнцыям – росту агламерацый. Яна дапамагае асэнсоўваць выклікі глабальнага горада, дзе межы паміж краінамі і гарадамі становяцца ўсё больш умоўнымі.

4 ***Сацыяльная інтэграцыя:*** экістыка падкрэслівае ролю чалавека і супольнасці. Сёння гэта актуальна для праектаў, якія накіраваны на сацыяльную згуртаванасць, інклюзію і справядлівае размеркаванне рэсурсаў.

5 ***Культурная ідэнтычнасць:*** у сучасным урбанізме важна захоўваць традыцыі і культурныя асаблівасці. Экістыка прапануе бачыць культуру як адзін з пяці базавых элементаў паселішча.

Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь займае каля 207 тысяч квадратных кіламетраў, на якіх размешчана 115 гарадоў, 85 пасёлкаў гарадскога тыпу і каля 24 тысяч вёсак. Уся гэтая сістэма ўзаемазвязана і развіваецца паводле стратэгіі, зафіксаванай у Дзяржаўнай комплекснай схеме тэрытарыяльнай арганізацыі (ДКСТА), што была зацверджана ў 2011 г. і мае тэрмін дзеяння да 2030 г. Аднак хутка паўстане неабходнасць у яе карэкціроўцы, а магчыма нават у кардынальнай змене падыходаў да планавання.

Альтэрнатывай такому падыходу могуць стаць ідэі К. Даксіядаса і яго навука экістыка. Яна прапануе сістэмны погляд на развіццё паселішчаў, у якім у цэнтры знаходзіцца чалавек і яго ўзаемадзеянне з прыродай, грамадствам, архітэктурнымі абалонкамі, сеткамі і культурай.

Такім чынам, праведзенае даследаванне паказала, што навука аб чалавечых паселішчах, распрацаваная К. Даксіядасам, застаецца актуальнай і сёння. Экістыка прапануе сістэмны падыход да разумення і развіцця паселішчаў, у якім у цэнтры знаходзіцца чалавек і яго ўзаемадзеянне з прыродай, грамадствам, архітэктурнымі абалонкамі, сеткамі і культурай.

Экістыка можа стаць метадалагічным каркасам для сучаснага і будучага горадабудаўніцтва. Яна дазваляе аб’яднаць тэхнічныя, сацыяльныя і культурныя падыходы, каб будаваць гарады, якія будуць не толькі функцыянальнымі, але і чалавечнымі, устойлівымі і гарманічнымі.

## Спіс літаратуры

1 **Brown, N.** Constantinos Doxiadis: Ekistics / N. Brown. – New York : [s. n.], 1968. – 245 p.

2 **Doxiadis, C. A.** Ekistics: An introduction to the science of human settlements / C. A. Doxiadis ; presented by John Peponis. – Athens : Athens Center of Ekistics, 1968. – 120 p.

3 Доксиадис, Константинос // Википедия. – URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/Доксиадис,_Константинос (дата обращения: 10.12.2025).

4 **Doxiadis, C. A.** Ekistics, the science of human settlements / C. A. Doxiadis // Science. – 1970. – Vol. 170, № 3956. – P. 393–404.

5 **Пратасова, Ю. А.** Тэорыя архітэктуры : вучэб. дапам. / Ю. А. Пратасава, І. А. Іода, В. А. Сысоева. – Мінск : БНТУ, 2015. – 124 с.

6. **Theodosis, L.** Systemic Methods and Large-Scale Models in Ekistics / L. Theodosis // Nexus Network Journal. Architecture and Mathematics. – 2020. – Vol. 22, № 3. – P. 597–613. – URL: https://doi.org/10.1007/s00004-020-00531-y (date of access: 10.12.2025). – DOI: 10.1007/s00004-020-00531-y.